ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 29 (1298) | ПЯТНІЦА, 6-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

| | |
|---|---|
| 1 месяц | 30 кап. |
| 3 месяцы | 90 „ |
| 6 месяцаў | 1 р. 80 „ |
| 1 год | 3 р. 60 „ |

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Сёньня, 6-га лютага, роўна а 6 гадз. ўвеч., ў памяшканьні Дому Комасьветы імя Карла Маркса адбудзецца

**АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД**

актыву Менскай Гарадзкой організацыі ЛКСМБ

з наступным парадкам дню:

**Вынікі IX і X зьездаў комсамолу** (даклад. т. ПАЛЯКОЎ).

Білеты на актыў трэба атрымаць сёньня ў гаркоме з 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін дню.

## За люты месяц выканаць гадовы плян ільназагатовак

### Пастанова ЦК ЛКСМБ аб ходзе выкананьня пляну ільназагатовак і ўдзел ЛКСМБ

Бюро ЦК ЛКСМБ констатуе яўна нездавальняючы ход выкананьня пляну ільназагатовак. На 25-I-31 г. ня гледзячы на тое, што тэрмін выкананьня ўсяго пляну даўно сьцёк, гадовы плян выкананы на 25 проц. Асабліва недапушчальнае становішча з выкананьнем цьвёрдага заданьня кулацка-заможнымі гаспадаркамі, якія ў шэрагу раёнаў поўнасьцю ня выяўлены. Тлумачыцца гэта тым, што шэраг раённых камітэтаў і ячэек яўна бязьдзейнічаюць ў выкананьні пляну ільназагатовак, недаацэньваюць політычнага значэньня своечасовага іх выкананьня і спадзяюцца на самацёк, праяўляючы правы ўхіл на практыцы. Асабліва адстаюць: Валыніцкі, Парыцкі, Мазырскі, Юравіцкі, і Ветрынскі РК КСМ, ў якіх плян выканан да 5 проц.

Адзначыць, што зусім слаба разгорнута масавая політ-выхаваўчая праца сярод колгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, недастаткова мобілізоўвалася ўвага друку („Чырвоная Зьмена“, „Юнгер Арбейтэр“) вакол выкананьня ільназагатовак. Зусім адсутнічала соц. спаборніцтва і рад іншых форм (абозы, грамадзкі буксір), мобілізуючыя масы на пасьпяховае выкананьне ільназагатовак. Выходзячы з вышэйадзначанага, бюро ЦК пастанаўляе:

1. Прапанаваць раённым камітэтам зараз-жа абгаварыць на паседжаньні бюро стан работы па выкананьню плянаў ільназагатовак і прыняць конкрэтныя меры, якія-б забясьпечылі поўнае іх выкананьне. Абвясьціць штурмавы двухдэкаднік па ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках, у час якога павінны быць мобілізаваны на практычную работу усе комсамольцы. Адказнасьць за поўнае выкананьне ўсяго пляну вёскі, колгасу і сельсавету ўскласьці на ячэйку і кожнага комсамольца паасобку.

На бліжэйшым паседжаньні сакратарыяту заслухаць інформацыю адстаючых раёнаў аб прынятых імі мерах па забясьпечаньню выкананьня пляну ільназагатовак.

2. Мобілізаваць 15 чалавек цэнтральнага актыву і 135 нізавога з гарадоў: Менску, Віцебску, Гомеля, Магілева, Бабруйску, Барысава, Воршы і Полацку для дапамогі адстаючым раёнам. Акрамя гэтага, гэтым-жа гаркомам, і асабліва з тэкстыльных прадпрыемстваў, паслаць масавыя ўдарныя рабочыя брыгады ў ільназагатоўчыя раёны. Даручыць тав. Рудніцкаму распрацаваць разьвёрстку і парадак выездаў.

3. Адзначаючы, што ў шэрагу месц пляны не даведзены да вёсак, колгасаў і асабліва зьменшаны цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам у паасобных раёнах, лічыць неабходным правесьці масавую праверку давядзеньня пляну да кулацкага двара. Мобілізаваць усіх комсамольцаў, „ЛК“, беспартыйную колгасную, бядняцка-серадняцкую моладзь на правядзеньне гэтага мерапрыемства.

4. Зараз-жа вылучыць брыгады, якія павінны ўзяць на вучот неапрацаванае ільна-валакно і прыняць неабходныя меры да найхутчэйшай яго апрацоўкі і адпраўкі па адпаведных організацыях.

5. Атрадам „ЛК“ зараз-жа праверыць работу ўсіх організацый з пункту погляду выкананьня імі дырэктыў партыі па ільназагатоўках, а таксама работу коопэрацыйнай сыстэмы з пункту погляду правільнасьці разьмеркаваньня імі прэміяльных фондаў, якія стымулююць ільназагатоўкі.

6. Усім комсамольскім організацыям шырока разьвіць соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, бяручы на грамадзкі буксір адстаючыя колгасы, савгасы, вёскі і раёны, забясьпечыць, такім чынам, поўнае выкананьне пляну на працягу штурмавога двухдэкадніку. Для найлепшага і больш пасьпяховага выкананьня пляну ільназагатовак выклікаць на соц. спаборніцтва Заходнюю вообласьць. Умовы даручыць распрацаваць тав. Рудніцкаму.

## Падтрымаць ініцыятыву чэрвенцаў

## Пабудуем дырыжабль „Комсамолія БССР“

Мы ўчора ўперадавой да 4-й старонкі кароценька азнаёмілі чытачоў з шалёным будаўніцтвам паветраных флётаў у капіталістычных краінах.

У Амэрыцы за адзін толькі год пабудаваны 3224 самалёты.

У Польшчы ўзмоцнена запасаюцца ўсім відамі зброі, у прыватнасьці зьнішчальнікамі.

Самалёты абсталёўваюцца хэмічнымі бомбамі.

У часопісу „Пшэглёнд Лётнічы“ капітан Бартэль Зыгфрыд піша: адзін самалёт падымае 20 бомб па 25 кілёграм, альба 10 бомб па 50 кілёграм. Адна бомба здольна заразіць плошчу ў 200 квадратных мэтраў“.

Усе гэтыя высока тэхнічныя ваенныя прылады будуць кінуты на нас для зьнішчэньня краіны будуючагася соцыялізму. Мы павінны будзем адбіць атаку разьюшанага імпэрыялізму і бязумоўна адаб'ём. Але для гэтага і ў нас павінен быць магутны ваенны паветраны флёт.

Ініцыятыва і энтузіязм працоўных Савецкага Саюзу па збору сродкаў у фонд пабудовы дырыжабляў, самалётаў, жалезны фонд імя IX зьезду УсеЛКСМ гаворыць аб тым, што мы, узмацняючы паветраны флёт новымі сталёвымі адзінкамі, зробім яго, як ні ў якой краіне, магутным абаронцаю мірнага соцыялістычнага будаўніцтва.

У дзень 50-годзьдзя тав. Варашылава, Чэрвеньскі агульна комсамольскі сход рашыў пабудаваць дырыжабль імя „Комсамолія БССР“ і робіць першы ўзнос у суме 320 р.

Ініцыятыву Чэрвеньскага комсамолу павінна падтрымаць уся комсамолія Савецкай Беларусі.

Хай дрыжыць вораг перад магутным паветраным караблём „Комсамолія БССР“.

Хай дрыжыць перад магутным Чырвоным паветраным флётам!

# ЖУДАСНЫЯ КАТАВАНЬНІ У ЛУЦКУ ЗАХАВАЦЬ НЯ УДАСЦА

## Растрэламі, арыштамі і разгромамі ня выратавацца фашыстым ад крызісу, які іх душыць

### Фашысцкі ўрад хоча затушаваць луцкую справу

ВАРШАВА, 4. На ўчарайшым паседжаньні сэнату міністр унутраных спраў Складкоўскі зрабіў заяву з прычыны катаваньняў рэволюцыйных рабочых у Луцкай турме.

— „З некаторага часу, — сказаў Складкоўскі,—у друку сталі зьяўляцца лісты з турмаў адносна сьледчага аддзелу ў Луцку. У гэтых лістох, якія мне былі вядомы ўжо два месяцы таму назад, паведамлялася аб фактах гвалтаваньня няпоўналетніх комсамолак, зьбіеньня зьняволеных ужываньня так званых беластоцкіх катаваньняў, г. зн. уліваньня ў рот вады і мачы.

Я пастанавіў разагнаць гэты сьледчы аддзел, што мною ўжо было зроблена 10 дзён таму назад“.

Заява Складкоўскага сьведчыць аб тым, што ўрад хоча затушаваць луцкую справу і скончыць яе толькі разгонам сьледчай часткі луцкай турмы. У заяве надзвычайна важна пацьверджаньне міністрам катаваньняў політзьняволеных. Незразумела, што разумеецца пад разгонам сьледчага аддзелу. Вядома толькі, што такі разгон азначае адкамандыраваньне тых-жа чыноўнікаў у іншыя поліцэйскія ўстановы, дзе яны працягваюць практыкаваць свае старыя мэтоды.

Заява аб разгоне сьведчыць, што аб прыцягненьні вінаватых да адказнасьці няма і гутаркі. Дзіўна таксама, чаму сьледчыя камісіі былі пасланы толькі ў Брэст і Лодзь, ня гледзячы на тое, што ў лістох політзьняволеных гаворыцца, што такія-ж мэтоды катаваньняў ужываліся ў Львоўскай турме, а таксама ў Вострава-Мазавецкай.

### Сямейная сварка ў лягеры польскага фашызму

ВАРШАВА 2.—Варшаўскі суд, які разьбірае зараз справу аб „замаху“ на Пільсудзкага, сёньня нечакана прыняў пастанову аб адтэрміноўцы судовага паседжаньня на 14 дзён.

Повадам для адтэрміноўкі паслужыў настолькі-ж нечаканы „замах“ на галоўнага сьведку абвінавачваньня—поліцэйскага провокатара Пуржыцкага. Згодна поліцэйскаму паведамленьню, Пуржыцкі быў пазаўчора схоплены невядомымі, якія вызезлі яго ў аўтомобіле за горад і мкнуліся забіць. Па словах Пуржыцкага, сядзеўшы з ім поруч ў аўтомобілі невядомы стрэліў у яго ва ўпор. Потым, думаючы, што Пуржыцкі забіты, невядомыя кінулі яго ў роў і ўцяклі.

На самой-жа справе,—гаворыць Пуржыцкі,—я быў лёгка паранены і толькі страціў прытомнасьць. Тым больш, што, як высьветлілася на сёньнешнім судовым паседжаньні, хутка пасьля „замаху“ Пуржыцкі спакойна сьнедаў у бліжэйшым рэсторане.

### За адзін тыдзень выкінута на вуліцу 10.000 рабочых

ВАРШАВА, 4. Згодна апублікаваных гэтымі днямі даных, колькасьць беспрацоўных на 31 студзеня дасягнула 341.183 чалавек. За адзін тыдзень засталося без работы 10 000 чалавек.

### 22 паветы бяз усялякіх сродкаў да існаваньня

ТОКІЁ, 3. Па паведамленьню Харбінскага друку, у сувязі з катастрофічным падзеньнем цэн на рыс, а таксама надзвычайна нязначным ураджаем рысу, корэйскія сяляне ў 22 паветах Харбінскай акругі засталіся бяз усякіх сродкаў да існаваньня.

### Крывавыя сутычкі паміж беспрацоўнымі і поліцыяй

ПРАГА. 3. У Чэха-Славакіі адбыліся ў шэрагу гарадоў дэмонстрацыі беспрацоўных. У Шумпэрку (Моравія) у час дэмонстрацый 1400 беспрацоўных тэкстыльшчыкаў адбыліся крывавыя сутычкі паміж дэмонстрантамі і поліцыяй. Паранена некалькі рабочых і 9 поліцэйскіх.

### Румынія будуе завод выбуховых матэрый

РЫМ, 3. Па паведамленьню з Бухарэсту, Румынія заключыла з фірмай Шкода (якая ўладае ваеннымі заводамі Чэха-Славакіі) дагавор, на падставе якога фірма абсталюе ўнутры румынскай сталіцы грандыёзны завод выбуховых матэрый і ваенных прыклад. У будаўніцтве прыме таксама ўдзел француская фірма ваенных заводаў Шнэйдэр-Крэзо.

### Развал саюзу соцыялістычнай моладзі

БЭРЛІН, 3. Па ўсёй Нямеччыне прыпягваецца развал саюзу соцыялістычнай моладзі. Распушчана мясцовая група саюзу ў горадзе Мэльлё, пераважная большасьць членаў якое перашла ў комсамол.

### Сур'ёзная сутычка фашыстых з комуністымі

БЭРЛІН, 2—Учора ўвесь дзень былі сур'ёзныя сутычкі паміж нацыянал-соцыялістымі і комуністымі.

У Штутгарце нацыянал-соцыялістыя (фашыстыя) імкнуліся сарваць комуністычны сход, аднак, рабочыя далі ім рашучы адпор.

### Арышт усіх дэлегатаў зьезду левай ППС

ВАРШАВА, 3. Першага лютага ў Лодзі адчыніўся другі агульна-краёвы зьезд левай ППС. Уся падрыхтоўка да зьезду, як і самы зьезд, праходзіла зусім легальна. Аб дні і месцы склікаНьня зьезду былі выпушчаны спэцыяльныя плякаты. На зьезд, акрамя дэлегатаў, з усёй Польшчы прыбыла вялікая колькасьць гасьцей.

А 2-ой гадзіне дня 2 лютага ў залю паседжаньня зьезду прыбыла поліцыя, якая арыштавала ўсіх 350 чалавек, што знаходзіліся ў залі. Затрыманыя адвезены на поліцэйскіх аўтомобілях у ахранку.

### „Уціхамірваньне“ Заходняй Украіны



Больш двух месяцаў працягваўся пагром украінскага насельніцтва ў Заходняй Украіне. Карныя экспэдыцыі пільсудчыкаў па сваіх зверствах пераважылі нават зьверствы карных экспэдыцый царскіх часоў.

НА ЗДЫМКУ: сьляды „уціхамірваньня“ на целе Кірылы Шпіры (сяло Підзярэва).

# ПРАДСТАЎНІКА СТАРОЕ ГВАРДЫІ ЛЕНІНЦАЎ, НЕПРЫМІРЫМАГА БАРАЦЬБІТА ЗА ЛЕНІНІЗМ ВІТАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ

## Старому бальшавіку, загартаванаму ў бойках пролетарыю—комуністычнае прывітаньне

**Тав. Варашылаў! У дзень тваіго 50-годзьдзя ЦК УсеКП(б) вітае ў тваёй асобе выпрабаванага і загартаванага ў бойках пролетарыя, старага бальшавіка, організатара і бальшавіка організатара і кіраўніка будаўнікоў і байцоў нашай ленінскай партыі.**

**Партыя бачыла цябе ў перадавых шэрагах бальшавікоў у доўгія гады падпольля, калі ні праследаваньні царскіх катаў, ні провокацыя банд Керанскага не маглі зламаць тваёй нязломнай бальшавіцкай энэргіі і волі да барацьбы за дыктатуру пролетарыяту, за перамогу соцыялізму ў СССР.**

**Партыя ведае тваё баявыя заслугі на франтох грамадзянскай вайны. Яна ведае цябе, як аднаго з першых організатараў рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.**

**Пад тваім бальшавіцкім кіраўніцтвам расьце наша рабоча-сялянская Чырвоная армія, здольная даць адпор ворагам Савецкай рэспублікі.**

**Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) в тае цябе, як непахіснага бальшавіка, як непрымірымага барацьбіта за ленінізм, як аднаго з лепшых прадстаўнікоў старое гвардыі ленінцаў і кіруючага ленінскага штабу—ЦК нашай партыі.**

**ЦК УсеКП(б)**

### Працоўныя Менску організуюць брыгады імя Варашылава

З 5-га лютага праводзіцца месячнік праверкі шэфства працоўных над Чырвонай арміяй. Намечана ў час месячніку перабудаваць усю шэфскую работу шляхам узмацненьня ўдзелу чырвонаармейцаў у вытворчых плянах прадпрыемстваў.

Рабочыя прапануюць організаваць на прадпрыемствах ударныя брыгады імя тав. Варашылава і брыгады імя гадавіны Чырвонай арміі. У дні юбілею будзе праведзена популярызацыя сярод працоўных вайсковай літаратуры.

На прадпрыемствах, у часе абедзеных перапынкаў, у клюбах будуць праведзены вечары, прысьвечаныя гісторыі Чырвонай арміі і яе правадыру— тав. Варашылаву.

Намячаецца экскурсія рабочых у дом Чырвонай арміі.

## У дзень юбілею Варашылава аднаасобнікі абяцаюць выканаць пасеўныя пляны

(Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).

**ЧАШНІКІ 5. У Іванскім сельсавеце адбыліся сходы, прысьвечаныя юбілею тав Варашылава. Аднаасобнікі пасёлку „Новыя Бярдзені“ абавязаліся выканаць пляны севу, абвясьцілі сабе ўдарнікамі за вывазцы лесу і выклікалі на соцспаборніцтва вёску „Новы Сьвет“**

**Аднаасобнікі вёскі Дзямідавічы пастанавілі наладзіць збор сродкаў у фонд пабудовы дырыжабля імя Варашылава і організаваць ячэйку Асоавіяхаму.**

**ПУЗІКАЎ.**

## Па шляху правадыра

Сёньня на політзаанятках прапрацоўваем жыцьцёпіс Кліма Варашылава.

Задумёныя, сур'ёзныя твары... Слухаюць маладыя байцы...

... Як жыў правадыр, як луганскі сьлесар Варашылаў праходзіў поўны гэроізму, адданасьці, баявы шлях да лепшага правадыра адзінай пролетарскай Чырвонай арміі.

Ціха... Надзвычайная нейкая ў гэтым чырвонаармейскім пакоі цішыня. Сядзяць нярухома. Відаць, што думаюць, разважаюць.

Аб чым?..

Вось гэты,—што скраю прымасьціўся на зэдліку, сядзіць трохі ўзьняўшы галаву, паклаўшы нярухома рукі,—Падгорны, чырвонаармеец. Адзін з лепшых ударнікаў—варашылаўцаў асобнага конардзіву.

Упяршыню я ўбачыў яго ў гэткім спакойным нярухомым стане. Я бачыў яго ў канюшні. Ён чысьціў каня. Шчарка бегла ў яго руках па бліскучых баках каня шчотка. Ён мыў яго, чысьціў, абыходзіў навакол і любоўна гладзіў яго. Конь—таварыш байца.

У прыгожа расчэсанай грыве яго каня акуратна ўплецена чырвоная стужка. Гэта ад брыгады дывізыёну за лепшы догляд за канём.

У нас у дывізіёне складзена брыгада, якая сочыць за тым, як чырвонаармейцы абыходзяцца з конямі. Лепшым байцам, чыстым, здаровым коням брыгада дае чырвоную істужку. Першым—мачаху.

У каня Падгорнага ўвесь час істужка. Ён—з лепшых.

А вось з ім чырвонаармеец Машынін. Першы ў дывізіёне ўдарнік—варашылавец, першы організатар ударнай брыгады імя Кліма Варашылава.

А побач з імі Шапкін, Ераконаў, і яшчэ : яшчэ... ударнікі. Байцы. варашылаўцы.

9 ударных варашылаўскіх брыгад. Яны слухаюць як жыў Клімэнт Яфрэмавіч, яны ідуць па яго шляху—шляху ленінскай УсеКП(б).

Яны лепшыя байцы.

Б.

### 1.200 тысяч сабрана ў фонд пабудовы дырыжабля „Клім Варашылаў“

У сучасны момант у фонд будаўніцтва дырыжабля „Клім Варашылаў“ сабрана больш 1.200 тыс. р. Цэнтральны Савет Асовіяхіму СССР у сувязі з 50-цігодзьдзем тав. Варашылава пастанавіў узмацніць збор сродкаў на пабудову дырыжабля яго імя.

***

Менская шчотачная ф-ка да 50-цігодзьдзя Варашылава адпрацавалі адну гадзіну на карысьць пабудовы дырыжабля „Клім Варашылаў“. Сабрана 495 руб. грошай.

# Аб задачах соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі

### З прамовы тав. Шаранговіча на пленуме ЦК КП(б)Б*)

## За ўмацаваньне соцыялістычнага сэктору

Але разам з тым, мы зрабілі-б зусім няправільна, калі-б ня звярнулі ўвагу на слабасьцей і хворых бакоў колгаснага … Асноўнае—гэта пытаньне аб організацыі працы ў колгасах, аб бесгаспадарчасьці, аб працоўнай дысцыпліне, пытаньне аб разгортваньні ўсіх форм соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якія яшчэ зараз стаяць на нізкім узроўні.

Выходзячы з такой ацэнкі і прымаючы пад увагу ўсю будучую работу, асабліва ў веснавую пасеўную кампанію,—цэнтральным пытаньнем павінна стаць перад усёй парторганізацыяй, і перш за ўсё перад Колгасцэнтрам, пытаньне аб організацыі працы і правільнага гаспадараньня ў колгасах, павышэньне працоўнай дысцыпліны і разгортваньне ўсіх форм соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

З гэтым трэба зьвязаць, у першую чаргу, пытаньне аб чыстцы нашых колгасаў ад кулацкіх элемэнтаў. У лісьце ЦК па гэтаму пытаньню даюцца падрабязныя ўказаньні. Але трэба ўказаць зараз, што ў сувязі з пераходам усё большага шырокага масавага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы і падрыхтоўкай да веснавой пасеўной кампаніі, у сувязі з перавыбарчай кампаніяй, якую мы праводзім у колгасах,—асноўнай задачай павінна быць—ачыстка колгасаў ад кулацкіх элемэнтаў. Засьмечанасьць колгасаў кулацкімі элемэнтамі па сёньняшні дзень яшчэ вялікая. І тэму задачы ачысткі колгасаў ад кулацкіх элемэнтаў трэба аддаць больш увагі.

З пытаньнем колектывізацыі і рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, бясспрэчна трэба цесна зьвязаць пытаньне аб саўгасным будаўніцтве, якая вызначаецца ў бягучым і сьпадарчым годзе.

Калі даць ацэнку таго стану, у якім знаходзяцца існуючыя саўгасы, дык мне здаецца, што яны яшчэ не зьяўляюцца ў поўным сэнсе слова сапраўды паказальнымі, і такім чынам, ня служаць у патрэбнай меры ваґарамі ў соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі БССР.

І таму пытаньне ўмацаваньня саўгасаў і асабліва ў сувязі з разгортваньнем такой вялікай програмы саўгаснага будаўніцтва, павінна быць аддадзена, як гэта ўжо правільна падкрэсьлівалася, значна больш увагі з боку ўсёй парторганізацыі, чым зараз.

Я хацеў-бы падкрэсьліць пытаньне аб сувязі саўгасаў з вакольным насельніцтвам. І ў першую чаргу з колгасамі. Саўгасы павінны ўплываць на соцыялістычную рэконструкцыю сельскае гаспадаркі. Ці ўплываюць зараз саўгасы ў гэтых адносінах на сельскую гаспадарку? Я-б сказаў, што не ўплываюць, або прыкметна … чальныя меры. Сувязі саўгасаў з колгасамі амаль не існуе. Таму мы падкрэсьліваем у адным з пунктаў рэзолюцыі гэту задачу і … пытаньне сувязі праз вытворчыя пляны.

Тыя задачы, што стаяць перад намі ў адносінах соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, азначаюць рэзкі пералом у адносінах спэцыялізацыі.

## Аб жывёлагадоўлі

Акрамя таго, што мы вызначаем па лініі саўгаснага і колгаснага будаўніцтва, у гэтай галіне стаіць вельмі востра пытаньне аб жывёлагадоўчых соцыялістычных сэктарах. Добрая пастаноўка работы ў соцыялістычным сэктары, больш вялікія тэмпы колектывізацыі забясьпечаць правядзеньне мерапрыемстваў, якія мы вызначаем у адносінах барацьбы з разбазарваньнем жывёлы, … мы поўнасьцю выканні.

Але мне здаецца, што гэта не ўсё. Урад вызначае за намі мерапрыемствы па лініі ўмацаваньня нашай увагі да вырашэньня жывёлагадоўчай проблемы мы зможам хутчэй перавесьці з індывідуальнага сэктару ў соцыялістычны; у прыватнасьці асабліва вострае стаіць пытаньне аб сьвінагадоўлі. Мы зараз вызначаем 60 тыс. сьвінаматак, якія трэба будзе паставіць у соцыялістычны сэктар. Як і дзе іх здабыць і атрымаць? Мы павінны надумаць аб тым, якімі масавымі мерапрыемствамі па лініі, напрыклад, … абавязкова з індывідуальнага сэктару ў соцыялістычны, скарачаюць гэтую нехапаючую колькасьць сьвінаматак.

## Падрыхтуем другую колгасную вясну

Пасеўная кампанія павінна стаць для нас поўным пералом этапам у адносінах ажыцьцяўленьня ўсіх мерапрыемстваў, якія вызначаюцца па рэконструкцыі сельскае гаспадаркі і перш за ўсё забясьпечыць павышэньне тэмпаў колектывізацыі, … рабіць баявой бальшавіцкай весны.

Якое мы зараз маем становішча з разгортваньнем падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі? Я-б сказаў, што ў гэтых адносінах мы яшчэ больш за ўсё займаемся бюрократычным таптаньнем на месцы.

Трэба сказаць, што да гэтага часу яшчэ працягваецца таптаньне і гаворкі вакол плянаў. Трэба рашуча пакончыць з усякімі гутаркамі і тармажэньнямі вакол пляна. Пасеўныя ўдакладненьні, якія могуць быць, трэба зрабіць на-хаду, але не ператвараць гэтага па сутнасьці ў барацьбу супроць тэмпаў, у барацьбу супроць програмы, якая намечана па лініі рэконструкцыі сельскае гаспадаркі і пашырэньня пасеўнага кліну.

Гэта барацьба супроць плянаў ёсьць правы опортунізм на практыцы. Толькі так трэба проста і рэзка кваліфікаваць барацьбу супроць плянаў, якую мы маем з боку шэра у раёнаў.

Я лічу, што пленум павінен рэзка сказаць усёй партыйнай організацыі—трэба пакончыць з усімі агіднасьцямі ў адносінах тых раёнаў, якія працягваюць, ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы ЦК, гутаркі і спрэчкі аб плянах.

Нам трэба рашуча павярнуцца тварам да падрыхтоўкі пасеўнай кампаніі, перастаць таптацца ў канцылярыі павярнуць усю пролетарскую грамадзкасьць да гэтага пытаньня, зьвязваючы ўсю пасеўную кампанію з павышэньнем тэмпаў колектывізацыі.

Два асноўныя пытаньні, якія забясьпечваюць посьпех кампаніі—гэта пытаньне аб насеньні і мобілізацыі тэхнічных рэсурсаў і цягавай сілы.

Пленум павінен указаць на тое, што раёны, Наркомзем і ўся сыстэма павінны ня толькі паказаць, як яны давялі плян да вёскі, ко гасу, па асобнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі ў парадку масавай работы або ў парадку самаабавязацельства, а як гэты плян забясьпечваецца насеньнем, тэхнічнай і цягавай сілай.

Я думаю, што адначасова з пытаньнем аб правядзеньні пасеўнай кампаніі і ўсіх іншых задач, якія перад намі стаяць па рэконструкцыі сельскае гаспадаркі, трэба з усёй вострасьцю паставіць пытаньне аб кадрах для ўсіх сыстэм па лініі сельскай гаспадаркі.

Перагледзець кадры павінен Цэнтральны камітэт і раённыя камітэты партыі, перагледзець усе кадры зьверху данізу і зьнізу даверху з пункту гледжаньня як яны забясьпечваюць сапраўды бальшавіцкае правядзеньне тэй напружанай програмы па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, якую мы намячаем на 1931 год.

Трэба ня толькі паглынуць 165 млн. руб., што ўкладаюцца ў сельскую гаспадарку, і ня толькі іх скарыстаць, а трэба выкарыстаць іх так, каб гэтыя 165 млн. далі сапраўды эфэкт вынікі каб мы прышлі к канцу году з якаснымі паказчыкамі; каб яны-б сапраўды далі пэўны вынік у перабудове сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад. І тут зусім правільна тав. Рачыцкі заявіў, што тэмпы перабудовы зьвязаны з пытаньнем аб кадрах. Тэмпы перабудовы нашых вышэйшых навучальных установаў адстаюць ад тэмпаў і патрабаваньняў спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў напрамку жывёлагадоўчых і тэхнічных культур. Усякае тармажэньне спэцыялізацыі вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў і, асабліва, сельска-гаспадарчых, было-б шкодным.

Як раёны ўсьвядомілі свае новыя задачы і ў сувязі з гэтым перабудаваліся?

Калі даць ацэнку ўсьведамленьня навыкавай адказнасьці і патрабаваньняў, якія ўскладаюцца на раёны, дык мне здаецца, што будзе правільна, калі мы скажам, што многія раёны ня зусім разумеюць, што ліквідацыя акруг прад'яўляе да іх зусім новыя патрабаваньні. Вядома, таварышы, гэта цесна зьвязана з пытаньнем аб кадрах, аб наяўнасьці людзкога складу, які забясьпечыў-бы правядзеньне ўсіх адказнейшых задач. Але ня толькі ў гэтым, гэта залежыць і ад таго, як іменна сама парторганізацыя растлумачыла і зразумела значэньне адказнасьці раёнаў.

Напрыклад, пытаньне спэцыялізацыі, усе шкоднікі паказваюць, што па лініі сельскае гаспадаркі Беларусі яны вялі вялізарную барацьбу і рабілі ўсё, што магчыма для зрыву спэцыялізацыі паасобных раёнаў. Што ў нас зараз атрымліваецца з пытаньнем аб спэцыялізацыі? Атрымліваецца тое, што шэраг раёнаў, чапляючыся за паасобныя факты, ня спыняць весьці ў тэй ці іншай меры барацьбу супроць рашучых мерапрыемстваў, якія вызначаюць і Наркомзем і ЦК у адносінах спэцыялізацыі раёнаў, а гэта азначае фактычна не даваць разгортацыі раёну ў поўным экономічным гаспадарчым напрамку.

Я думаю зараз, што правільна, часам, лаюць ЦК, калі мы часам не зусім гібкі ў размеркаваньні кадраў, не зусім задавальняем тых патрабаваньняў, якія раёны прад'яўляюць нам. Але, таварышы, трэба зразумець, што ў ЦК таксама ня нараджаецца актыў, што яго трэба выбіць і падрыхтоўваць на месцы. Патрабаваньні, якія прад'яўляюцца, … у 1500 чал. Ня можам мы голых патрабаваньняў задаволіць. У нас не так вялікая колькасьць кадраў і таму трэба паставіць пытаньне аб тым,—што побач з тымі патрабаваньнямі раёнаў, якія мы павінны будзем і далей ажыцьцяўляючы ўзмацненьне пролетарскага кіраўніцтва з боку гарадзкіх партыйных організацый, адначасова, раёны павінны выхоўваць і падрыхтоўваць у сябе кадры непасрэдна ў раёне з лепшых колгаснікаў перадавікоў, батрацтва і беднаты.

Патрэбна рашучае і сьмелае вылучэньне батрацтва, беднат і колгасьнікаў на кіруючую работу.

Патрэбна таксама больш узмоцнення дапамога вёсцы з боку пролетарскіх цэнтраў. Тут у нас ёсць бязумоўна некаторае аслабленьне дапамогі з боку гарадзкіх організацый, у адносінах ажыцьцяўленьня задач, якія мы пра одзім у вёсцы. Ёсьць некаторае замыканьне гарадзкіх організацый аслабленьне шэфскай работы і ўсёй іншай работы, зьвязанай з непасрэднай практычнай дапамогай вёсцы. Мы намячаем у веснавую кампанію больш масавую пасылку людзей з гораду (гэта зараз пасьля пленуму мы будзем практычна ажыцьцяўляць). Гэта павінна быць ня толькі мерай, зьвязанай з пасеўнай кампаніяй, але гэта павінна ў далейшым быць цесна ўвязана з узмацненьнем пролетарскай дапамогі і пролетарскага кіраўніцтва вёскай. Неабходна рашуча перабудаваць кіраўніцтва цэнтральных організацый раёнамі, павярнуць іх больш да задавальненьня запатрабаваньняў раёнаў. Устанавіць кіраўніцтва дыфэрэнцыяванае, з улікам усіх экономічных асаблівасьцяй раёнаў, узьмацніць жывую дапамогу, наладзіць праверку выкананьня. Гэта важнейшыя задачы, якія мы павінны на працягу бліжэйшага часу ажыцьцявіць.

## Змагацца за чыстату генэральнай лініі партыі

Усе мерапрыемствы, якія мы намячаем і абмяркоўваем на пленуме ў га іне соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, будуць з посьпехам выкананы пры ўмове рашучай барацьбы з опортунізмам і перш за ўсё з правым опортунізмам, я галоўнай небясьпекай, пры рашучай барацьбе з „левым“ опортунізмам. Але я хацеў-бы, таварышы падкрэсьліць, што гэта барацьба з правым і „левым“ опортунізмам павінна быць цесна зьвязана з тым, што мы рашуча павінны выкрыць і ўдарыць па групоўшчыне, якая адрывала часта ад дзелавой работы нашу парторганізацыю і тармазіла насьпяховае правядзеньне чарговых партыйных задач. Надземаўская справа, якая выкрыта, выявіла некаторыя факты, зьвязаныя з групавой барацьбою ўнутры парторганізацыі. Відавочна у бліжэйшы час партыйная організацыя будзе мець магчымасьць больш шырока выказацца па гэтаму пытаньню, але мне здаецца павінна быць падкрэсьлена і на гэтым пленуме тое, што барацьба з гэтым зьявішчам павінна быць зьвязана з яшчэ большай мобілізацыяй партыйнай організацыі ва ўсёй практычнай рабоце, на выкананьне нашых чарговых задач.

Побач з рашучай барацьбою з правым опортунізмам і „левымі“ загібамі, партыйная організацыя павінна ўдарыць па ўсякай групоўшчыне, якая накіравана была да тармажэньня. Без правядзеньня па-баявому ўсіх чарговых гаспадарча-політычных задач нельга ажыцьцявіць намечаныя вялізарныя задачы. Неабходна мобілізаваць усю партыйную організацыю, рабочую клясу, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкія масы сялянства на правядзеньне задач соцыялістычнага будаўніцтва і гэтым самым з посьпехам закончыць трэці, рашаючы год пяцігодкі. Вось да гэтага павінны быць накіраваны ўсе нашы намаганьні і ўся наша ўвага.

(Апладысмэнты).

*) Канец. Пачатак гл. у № 27 „Ч3“.




# „АЛІ РАСІЯ ПАКРЫЕЦЦА ГУСТОЮ СЕТКАЙ ЭЛЕКТРЫЧНЫХ СТАНЦЫЙ І МАГУТНЫХ АБСТАЛЯВАНЬНЯЎ, ЯК НАША КОМУНІСТЫЧНАЕ ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА СТАНЕ ЎЗОРНЫМ ДЛЯ БУДУЧАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭЎРОПЫ І АЗІІ“ (ЛЕНІН)

т. Юрк'янец

(ЦК ЛКСМБ).

## ...льш увагі кадрам

...згортваньне соц. спаборніцтва, ...ніцтва і рацыяналізатарскага ...ў на электростанцыях, зьбера... ...не электро энэргіі на вытвор... ...сі і хатняй патрэбе, орган зацыя ...у, нагляд і ўтварэньня буксіраў ...будаўніцтве электростанцый, о... ...зацыя электроачэек,—ва ўсіх ...х пытаньнях комсамол павінен ...яць самы актыўны ўдзел, пры... ...аючы да гэтай справы працоў... моладзь і дарослых рабочых. ...падры тоўкай рабочай сілы ...ва даволі дрэнная. Фабзавучы, ...месячныя курсы, як я існуюць ...ССР ня маюць праграм і мэта... Гэта вялізарнейшы вучастак, на ...трэба зьвярнуць больш увагі.

...пастанове ЦК УсеЛКСМ аб разь...ці электрофікацыі было адзна... ..., што зараз неабходна пакласьці ...ноўным пачатак прасованьню ...рабоча-сялянскія масы ведаў аб ...трофікацыі. Мы можам сказаць, ...на сёньнешні дзень рабочая ...а і сялянства ведае, што такое ...трычнасьць. Нам трэба правесьці ...агандy ідэі электрофікацыі. Га... ...аснова,

Тав. Чудноўскі

(Дзяржплян)

## ...номія апалу—на парадак дня

...рэба настаўіць пытаньне ня ...кі шэфства над электрычнасьцю, ... шэфства над энэргафікацыяй ...днае гаспадаркі. Гэта выкл... ...ца тым, што мы зараз маем ...ужанае становішча ня толькі ...ліне электрычнасьці, але і апа... ...што праблема электрофікацыі ...асецца ў праблему апалу.

...рыняцьце шэфства над энэрга...цыяй народнай гаспадаркі ня ...е распыленьнем сіл, а будзе ...ам на „вузкім“ месцы. Бела...кі камсамол некалькі пашырыў ...аноўку пытаньня, яно зводзіц... ...тану, каб увесь камсамол за... ...я пытаньнем апалу.

...іхто дагэтуль на Беларусі тол... не займаўся пытаньнямі апалу. ...рабуйце зьвярнуцца ў ВСНГ, ...о нічога ня скажа адносна па... ...ай гаспадаркі, аб нормах вы...званьня апалу і г. д. Я думаю, ...наша бліжэйшая задача—эка...зае выдаткаваньне апалу. Гэтым ...ньнем павінна заняцца кож... ...заводзкая ячэйка.

## Энэргію комсамолу—на фронт электрофікацыі

*„Комунізм—гэта электрофікацыя плюс Савецкая ўлада“*

*(ЛЕНІН)*

Саюз у асноўным зрабіў паварот тварам да вытворчасьці. Гаспадарчыя пытаньні сталі цэнтральнымі ў рабоце комсамолу. Барацьба саюзу за авалоданьне вузлавымі вучасткамі будаўніцтва знайшла свой конкрэтны выраз у прыняцьці шэфства над электрофікацыяй СССР.

Мы ўступілі ў такі пэрыод, які патрабуе хутчэйшага разьвіцьця электроэнэргетычнай базы пад усе галіны гаспадаркі краіны. У адпаведнасьці з гэтым кантрольныя лічбы на 1931 год намячаюць вялізнае паскораньне тэмпаў электрабудаўніцтва агульная магутнасьць усіх дзеючых электростанцый к канцу 1931 году павінна быць давядзена да 4 з паловай мільёнаў кілеват-гадзін, а вытворчасьць электроэнэргіі—да 12,7 млн. кілёват—гадзін замест 8,8 міл. кілёват—гадзін у 1930 годзе.

Выкананьне ўзятых на сябе шэфскіх абавязацельстваў магчыма толькі тады, калі пытаньні электрофікацыі к ніны стануць у цэнтры ўвагі ўсіх комсамольскіх організацый.

Комсамол павінен правесьці вялікую работу на прапагандзе ідэй электрофікацыі з тым, каб гэтыя ідэі дайшлі да кожнага працоўнага. Неабходна організаваць шырокую сетку гурткоў па вывучэньню электрычнасьці. Вывучэньне плянаў электрофікацыі павінна быць уключана ў праграмы ўсіх без выключэньня школ, у тым ліку і ў сетку комсамольскай політасьветы.

Бязьлітасная барацьба павінна быць абвешчана стратам электроэнэргіі. Выяўляючы конкрэтных носьбітаў зла, комсамол прымежніцкім адносінам да электроэнэргіі адначасова абавязан супроцьпаставіць барацьбу за поўнае выкарыстаньне „вольнай“ электроэнэргіі.

У барацьбе за датэрміновае выкананьне вытворчых і будаўнічых заданьняў неабходна ўжываць выпрабаваны мэтод—сустрэчны прамфінплян.

Трэба арганізаваць пасты і брыгады комсамолу на ўсіх электростанцыях якія будуюцца і рэконструіруюцца. Гэтыя пасты павінны выяўляць і перамагаць „вузкія месцы“, папярэджваць магчымасьці зрыву работы з-за недахопу сыравіны і абсталяваньня, дабівацца за ясьпечаньня будаўніцтва адпаведнай колькасьцю рабочае сілы і г. д.

Праз разьвіцьцё соц. спаборніцтва і ўдарніцтва праз організацыю масавага ініцыятыўнага руху вакол работы электрофікацыі, у бязьлітаснай барацьбе з опортунізмам як з правым, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, так і „левым“, пад кіраўніцтвам партыі ленінскі комсамол апраўдае званьне шэфа і дабʼецца выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады па электрычнасьці.

т. Барбараш

(В. Э. О.)

## Аўладаць электробудаўніцтвам

Комсамольская організацыя на будаўніцтве павінна сачыць за тэрмінам проектаваньня і тэрмінамі выкананьня будаўніцтва, бо бывае, што проект на электроабсталяваньне даецца ў апошні момант і потым з надзвычайнай гарачкай прыходзіцца весьці работу, што ўплывае на своечасовае заканчэньне работы.

Кожная комсамольская ячэйка павінна зьвярнуць увагу на ўкараненьне ведаў аб электрычнасьці ў шырокія масы рабочых. Энэргоячэйкі, дзякуючы шэфству комсамолу, змогуць правесьці гэта на заводах у сэнсе больш эконамнага карыстаньня электрычнасьцю, каб кожны матор быў загружаны і ня круціўся ўхаластую.

Для правядзеньня ідэй электрофікацыі неабходна мець масавую популярную літаратуру. На рынку такой літаратуры няма. Ясна, што комсамол, як шэф электрофікацыі, павінен паклапаціцца аб яе выданьні.

Комсамольскія організацыі на мясцох могуць дапамагчы прадпрыемствам мобілізаваць унутраныя электрорэсурсы. Часьцяком прыходзіцца затрымліваць разьвіцьцё і сканчэньне будаўніцтва, бо не хапае абсталяваньня, адпаведнай магутнасьці трансформатара і г. д.

Ясна, што тут комсамольская організацыя можа адыграць вялікую ролю.

Вялікае значэньне мае транспорт. Часта з-за несвоечасовай перакідкі будматар'ялаў затрымліваецца будаўніцтва. Комсамольская організацыі транспорту можа і павінна дапамагчы як найхутчэй прасоўваць матар'ялы і абсталяваньне.

т. Канопік

(„Комунар“)

## Правесьці ўдарны 10-дзёньнік

*Неабходна правесьці дзесяцідзённы паход для разгортваньня работы па электрофікацыі. Калі-б на нашым заводзе комсамольцы ў гэтыя 10 дзён накіравалі свае сілы і энэргію на эканомію электроэнэргі, на лепшае абслугоўваньне варштатаў, дык адчувалася-б, што комсамол сапраўды ўзяў шэфства над электрофікацыяй.*

*На нашым заводзе комсамольцы яшчэ не раскачаліся.*



Устанаўляем турбіны

Пайкін

(Эльвод)

## Забясьпечыць апалам

Эльвод, як і іншыя станцыі, працуе ў надзвычайна напружаных умовах. Адпаведныя органы ня цікавяцца тым, каб забясьпечыць станцыю апалам. Рабочым прыходзіцца працаваць без адпачынку, каб не дапусьціць прарыву.

Комсамольская організацыя павінна заняцца праверкай і рацыяналізацыяй скарыстаньня апалу, павінна сачыць за электроўстаноўкамі і рацыянальным скарыстоўваньнем матораў.

т. Бібэрман

(Інжынэр В. Э. А.)

## Чатыры пытаньні

Да гэтага часу электрофікацыя зьяўляецца вузкім месцам у нашай прамысловасьці, у сувязі з агромністым ростам прамысловасьці ў цэлым. Работа, настаўленая на чыста практычныя рэйкі, дала-б практычныя вынікі і магла-б вывесьці з цяжкасьцяй, якія мы перажываем.

У Маскве праведзена абсьледваньне цэлага раду ўстановак. Аказалася што цэлы рад матораў і трансформатараў не нагружаны, што эконамія ад рацыянальнай загрузкі іх складала-б 400 мільёнаў кілёват—гадзін. Гэта прыблізна каля 20 тыс. кілёват магутнасьці. Гэта раўняецца ўстаноўцы аднаго агрэгата ў 20 тыс. кілёват.

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў—першачарговая задача. Пытаньне прапаганды ідэй электрофікацыі, укараненьня электроведаў у масы—пытаньні сёньняшняга дня.

У асноўным усе гэтыя пытаньні можна падзяліць на некалькі частак: першае пытаньне—плянаваньне, другое—электробудаўніцтва, трэцяе—эксплёатацыі электра-энэргіі і чацьвертае—утварэньне кадраў і прапаганда электрофікацыі.

т. Голер

*Асінбуд*

## Электратэхніку—у сямігодкі

**Пры правядзеньні політэхнізацыі сямігодак пры школах заўсёды організуюцца сталярныя альбо сьлясарныя майстэрні.**

**Трэба зьвярнуць увагу на тое, каб пры школах, па магчымасьці, былі організаваны майстэрні, дзе школьнікі навучаліся-б справе электрофікацыі.**

**Гэтым трэба заняцца.**

т. Глезер

(„Чырвоная Зьмена“)

## Праблема апалу—галоўная праблема

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне электрофікацыі непарыўна зьвязана ...облемай апалу. Ва ўмовах Беларусі гэтай базай зьяўляецца торф. ... мы абмяркоўваем конкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьню ...ства над электрофікацыяй, на гэта пытаньне неабходна зьвярнуць ...ліву ўвагу. У гэтай галіне намі зроблена яшчэ надта мала.

Другое пытаньне популярызацыя ідэй электрофікацыі. Мала скла... ...паасобныя гурткі, неабходна заняцца больш глыбокай прапрацоў... гэтага пытаньня. Таварышы высунулі думку аб утварэньні габі... ...у па электрыфікацыі пры Доме Комсамолу. Трэба сказаць, што ...бота Дому Комсамолу пастаўлена дрэнна і калі мы разам з ячэйкамі ...ктро-ўстановаў не пастараемся разгарнуць гэту работу, то габінэту ...будзе. А такі габінэт павінен быць утвораны і стаць цэнтрам ...ілкай вопыту у галіне шэфства комсамолу над электрофікацыяй ...іны.

т. Сьляпян

(В. Э. О.)

## Стварыць паказальны габінэт

Работу па прапагандзе электромеханічных ведаў павінен узяць на сябе комсамол. Гэта трэба зрабіць шляхам утварэньня энэргэтычных ячэек на прадпрыемствах. Менскі Дом Комсамолу павінен арганізаваць электротэхнічны габінэт, каб даць комсамольцам мінімум электротэхнічных ведаў.

У сучасны момант Беларусь ня мае навучальнай установы, якая-б выпускала электротэхнікаў. Электратэхнічнага Інстытуту у нас няма, а толькі электротэхнічнае аддзяленьне Будаўнічага Інстытуту. Пры сучасным разьвіцьці электротэхнікі зусім залішне зьвязваць Будаўнічы Інстытут з Электротэхнічным аддзяленьнем.

Электротэхніка—зусім самастойная галіна, яна павінна мець асобныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія-б рыхтавалі высокакваліфікаваных спэцыялістых электрыкаў. Я думаю, што комсамол павінен пачаць барацьбу за адчыненьне такой установы.

Двухдэкаднік штурм

# ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫУ

## Організацыі ЛКСМБ дрэнна ўдзельнічаюць у ільназагатоўках. Кругляньскі, Прапойскі, Сьмілавіцкі, Хойніц і Чачэрскі Райкомолы ў палоне опортуністычнай практыкі

## ЗЛАМАЦЬ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ КУЛАКА І ОПОРТУНІСТЫХ НА ФРОНЦЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК, ДА 25-га ЛЮТАГА ВЫКАНАЦЬ ГАДАВЫ ПЛЯН

### Да 25 лютага выканаць гадовы плян

*З пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б*

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б на сваім пасяджэньні ад 2-га лютага заслухаў даклад аб ходзе ільназагатовак па БССР.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду, плян ільназагатовак фактычна сарваны. Раённыя організацыі да гэтага часу не давялі цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак. Прэзыдыум ЦКК адзначае, што сабатаж кулацка-заможных гаспадарак ня сустрэў з боку шэрагу раённых організацый бальшавіцкага адпору.

У выніку кулацка-заможныя гаспадаркі замест 4,5—5 тыс. тон здалі толькі 1 тыс. тон ільнавалакна.

Прэзыдыум ЦКК адзначае, што раённыя організацыі праявілі опортунізм на практыцы пры спаганяньні ільну з кантрактоўшчыкаў. Злосныя парушальнікі кантрактацыйных дагавароў ня былі прыцягнуты да судовай адказнасьці. Замест 2.500 тон кантрактанты здалі толькі 1.213 тон,

У выніку колгасы замест 4 тыс. тон лёну здалі толькі 1 тыс. тон.

Прэзыдыум ЦКК адзначае, што шэраг раёнаў, замест організацыі бедняцка-серадняцкіх мас супроць кулацкага сабатажу, замест шырокага ахопу беднякоў і сераднякоў самаабавязальствамі, праявілі злачынную бязьдзейнасьць.

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанавіў:

У мэтах пераадоленьня ільназагатовак на бальшавіцкія тэмпы організаваць з 5-га лютага двухдэкаднік штурму прарыву ў ільназагатоўках. У організацыі двухдэкадніку павінны прыняць удзел органы ЦКК-РСІ, раённыя партарганізацыі, профсаюзы, комсамол, газэты „Савецкая Беларусь“, „Беларуская вёска“, і „Чырвоная зьмена“; органы пракуратуры і суда, а таксама загатоўчыя організацыі і Наркомгандлю.

Двухдэкаднік павінен быць праведзен пад такім кутом погляду, каб да 25-га лютага скончыць гадовы плян загатовак ільну,

Раённыя апараты, КК-РСІ, пракуратура, суды, Наркамгандлю і РВК павінны быць мобілізаваны на 5 дзён для праверкі становішча ільназагатовак па ўсіх сельсаветах, выяўленьня вінаватых у нядавядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацкіх гаспадарак і зрыве плянаў. Тут-жа на месцы павінны быць організаваны пакаральныя суды над кулакамі і заможнікамі, якія саботуюць ільназагатоўкі, над злоснымі парушыцелямі контрактацыйных дагавароў і над працаўнікамі сельсаветаў, якія ігнорующь дырэктывы ўраду.

Неабходна мобілізаваць колгасныя масы на ударную апрацоўку лёну і выкананьне на працягу двухдэкадніку плянаў ільназагатовак як колгасамі, так і беднацка-серадняцкімі масамі вёскі, організуючы соцыялістычнае спаборніцтва паміж наасобнымі колгасамі і вёскамі.

Прокурору рэспублікі даручаецца на працягу двух дзён камандыраваць у Жлобінскі, Клічаўскі, Лядзянскі і Расонскі раёны адказных работнікаў прокуратуры, на выяўленьне вінаватых у ігнараваньні партыйных і ўрадавых дырэктыў па ільназагатоўках. Расьследваньне у гэтых раёнах павінна быць скончана не пазьней 8-га лютага.

Партколегіі — перадаць справы аб сэкратарох райкомаў і старшынях РВК наступных раёнаў: Кругляньскага, Прапойскага, Сьмілавіцкага, Хойніцкага і Чачэрскага, якія ня гледзячы на катэгарычныя прапановы ЦК і СНК, дагэтуль не паведамілі Наркомгандлю аб колькасьці кулацка-заможных гаспадарак, ахопленых цьвёрдымі заданьнямі, і ходзе іх выкананьня. Гэтыя справы павінны быць разгледжаны на працягу 5 дзён.

Наркомгандлю і Белкоопсаюзу запрапанавана прэміяваць здатчыкаў лёну, як правіла, выключна мануфактурай, павялічыўшы спэцыяльна для гэтай мэты фонды прэміяваньня і вызначыўшы нормы прэміяваньня па сэктарах.

Колгасцэнтру прапанавана на працягу двух дзён устанавіць сумесна з Белкоопсаюзам нормы і мэтоды прэміяваньня колгасьнікаў і рабочых саўгасаў, якія займаюцца апрацоўкай лёну, дэфіцытнымі таварамі.

Колгасцэнтр шляхам шэрагу мерапрыемстваў (перавод на зьдзельшчыну, організацыя ўдарніцтва) павінен забясьпечыць апрацоўку лёну у найбольш хуткія тэрміны.

Прэзыдыум ЦКК констатаваў пасыўнасьць комсамольскіх організацый і слабую работу профсаюзаў, асабліва саюзаў сельгасрабочых і тэкстыльшчыкаў у справе ільназагатовак.

Прэзыдыум пастанавіў паставіць перад ЦК ЛКСМ і фракцыяй ЦСПСБ пытаньне з тым, каб стварыць сапраўды пералом у рабоце гэтых організацый у ільназагатоўках, у прыватнасьці ў праведзеньні двухдэкадніку.

### Організавалі ашчадкасу

Пры Бабчынскім пэдтэхнікуме, сумесна з сямігодкай утворана ашчадкаса, якая будзе абслугоўваць усіх рабочых і служачых Бабчынскага сельсавету.

На агульным сходзе студэнтаў і вучняў вынясена пастанова аб тым, каб кожны вучань і студэнт унёс у ашчадкасу ня менш, як адзін рубель і завербаваў у яе аднаго ўкладчыка.

На комсамольскай ячэйцы былі вылучаны таварышы, якія організоўваюць брыгады з вучняў і студэнтаў і пойдуць вербаваць па вёсцы ўкладчыкаў у ашчадкасу.

Вучні.



### Лён ёсьць, трэба ўмець толькі ўзяць яго

Трэці год пяцігодкі зьяўляецца рашаючым годам для народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу—многаму абавязвае і льнапяньковую прамысловасьць па абслугоўваньню намечаных тэмпаў будаўніцтва, як па цяжкой індустрыі, так і па будаўніцтву, буйных колгасаў і саўгасаў, а таксама па ўзмацненьню абараназдольнасьці краіны.

Прад'яўляемыя патрабаваньні народнай гаспадаркі на вырабы ільняньковай прамысловасьці у прыватнасьці спэцвопратку для Чырвонай арміі і флёту, тару і мяхі на загатоўкі хлеба і бавоўны, брэзэнт і тканіну на спэцвопратку для прамысловасьці і транспорту, рыбалоўныя вырабы (сеці, дэлі, вяроўкі), для забясьпечаньня патрэб пуціны: а таксама канаты для лесасплаву і воднага транспорту і сноповязы для ўборкі хлеба,—ня могуць быць забясьпечаны пры такіх тэмпах загатоўкі вала на лёну і пяньку, нават у разьмерах той галоднай нормы патрэбы якая запроэктавана на 1931 г.

І ня трэба доўга распаўсюджвацца аб значэньні ільнапяньковай прамысловасьці, а даволі, уважліва апрачытаць пастановы ЦК УсеКП(б) і Саўнаркому СССР аб контрактацыі яравых пасеваў 1931 г., ня кажучы ўжо аб тым, што гэты гістарычны дакумант павінен быць шляхаводнай картай у рабоце 1931 г., каб сперакапацца, якое вялізарна палітычнае значэньне надаецца партыяй і ўрадам галіне лёну і каноплі, аб чым сьведчыць вялізарны размах па апрацоўцы і мэханізацыі гэтай культуры (150 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 75 тыс. сіл, 489 новых лёнапеньковых апрацоўчых заводаў да цяперашніх 38, 10 тыс. ільнацерабілак 600 комплектаў машын для гэтых заводаў. Якое нябывалае капіталаўкладжэньне ў гэтыя культуры, 1.500 тыс. цэнтнэраў мінэральных угнаеньняў, 60 млн. руб. для авансаваньня пасеўшчыкаў лёну і пянькі, 100 млн. руб. прамтавараў для продажу пастаўшчыкам лёну і каноплі і г. д.)

Пасьля такога гістарычнага і глыбока палітычнага дакуманту ЦК УсеКП(б) і Савету Народных Камісараў СССР, які ўзьнімае на нябывалую вышыню ў колькасьці і значнасьці ільнапяньководную галіну гаспадаркі, ці патрэбна даводзіць наколькі патрэбен лён і пянька і якую ролю яны іграюць у народнай гаспадарцы краіны будуючагася сацыялізму. Выдаць-бы не.

### Лічбы гавораць

Але вось калі зварочваешся да вынікаў работы па загатоўках лёну і пянькі на Беларусі, дык лічбы без слоў пачынаюць гаварыць аб тым, якое значэньне надаецца ільназагатоўкам, які палітычны зьмест і клясовы напрамак маюць гэтыя загатоўкі. Вось лічбы: на 25 студзеня загатоўкі па ільну выкананы толькі на 25 проц. пляну, а па пяньцы—8 проц., а прамысловасьць прымушана прастойваць, а экспорт ня выконваецца. Дынаміка-ж ходу загатовак характарызуецца падаючай крывой. Так, калі процант выкананьня за пяцідзёнку ад 20 сьнежня ўзяць за 100 і прасачыць па 5-дзёнках да 25 студзеня, дык малюнак зьявіцца ў наступным відзе ў процантах.

Па ўсіх раёнах цалкам: 20-XII—100, 25-XII—129, 30-XII—112, 5-I 31 г.—54, 10-I—54, 15-I—65, 20-I—61,5, 25—46 процантаў.

Аршанскі раён: 20-XII—100, 25-XII—60, 30-XII—70, 5-I-31 г.—13, 10-I—28, 15-I—4, 20-I—19, 25-I—70 проц.

Віцебскі раён: 20-XII—100, 25-XII—93, 30-XII—94, 5-I-31 г.—89, 10-I—56, 15-I-65, 20-I—129, 25-I—166 проц.

Аналёгічны малюнак і па астатніх раёнах, за выключэньнем паасобных, дзе плян выкананьня даходзіць да 80,5 проц., як Лёзна, Дрыса—66,9 проц. Вузьдзенскі—60,3, Кругляньскі—50,5 і толькі. Але ў шматлікіх раёнах процант выкананьня ніжэй усялякай крытыкі. Напрыклад:

Жлобінскі—5,9 проц., Гомельскі—6, Ветрынскі—3,4, Барысаўскі—9,6, Жураўліцкі—8,6, Капыльскі—6,8. Клічаўскі—6, Парыцкі—3,8, Мазырскі—4,8, Чэрыкаўскі—6,6 проц. і г. д.

### Колгасы здалі толькі 20,22 проц.

Слаба стаіць справа з пераапрацоўкай і здачай ільна-валакна па колгасах. Да гэтага часу здана толькі ільна-валакна па колгасах ня больш 20—22 проц. Акрамя гэтага, 22 проц. застаецца лёну ў саломе. Вучот нагул і ў прыватнасьці па здачы ільнавалакна пастаўлены дрэнна, а гэта затрудняе пастаноўку выразнай работы колгасу. Слабая дысцыпліна і адсутнасьць абмену вопытам, соцспаборніцтва і ўдарніцтва зразумела не магло не адбіцца на выніках ільназагатоўак па колгасах. Гэтым толькі і магчыма тлумачыць такія слабы тэмп ільназагатовак.

### Загатоўкі ідуць самацёкам

Адсюль значыцца, што ільна і пяньказагатоўкі ідуць катастрофічна слаба —самацёкам. Мобілізаваныя з цэнтральных апаратаў работнікі ў раёны, усе вярнуліся. Хто самавольна, хто з дазволам, але факт, што з раёнаў выехалі. Характэрна пры гэтым, што іх зваротам і іх работай на мясцох пры наяўнасьці слабых тэмпаў на ільназагатоўках ніхто ня цікавіўся, і абмен вопытам дзеля гэтага не праведзены. Ня гледзячы на дырэктывы ЦК і Саўнаркому Беларусі пералому ў лёнапеньказагатоўках няма. Наадварот,—намячаецца далейшае аслабленьне. Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры к пасылцы на месцы работнікаў і не ўдараць па самацёчных настроях, дык загатоўкі будуць сарваны.

Раённыя організацыі не настойліва праводзяць дырэктывы ЦК і Саўнаркому Беларусі, а падчас неахайна і політычна недапушчальна да іх адносяцца. Так, тэлеграма сэкратара ЦК тав Гея, у якой сыгналізавалася аб адсутнасьці сапраўднага пералому ў ільнапеньказагатоўках і характарызавалася такая іх плынь, як яўна опортуністычныя адносіны да гэтай важнейшай кампаніі, а таксама давалася дырэктыва клясавага падыходу да кулакоў, заможных і контрактантаў, якія ня выконваюць свае абавязацельства, з аднач асовым правядзеньнем агульна-політычнай кампаніі.

Акрамя таго запрашваліся весткі аб цьвёрдых заданьнях кулацка-заможным гаспадаркам: як яны выконваюць гэтыя заданьні, што прымаецца супроць злосных нездатчыкаў і г. д. І на гэта політычнае запытаньне большасьць раёнаў адгэсьлася няхайна, даўшы адны весткі, не адзначыўшы іншых, а некаторыя раёны лікам 21 нават не паклапаціліся даць адказу. Але што характэрна, гэта тое, што большасьць раёнаў—лікам 65—замаўчалі аб мерах спаганяньня з кулацка-заможных і злосных нездатчыкаў. Стварацца ўражаньне, што ў гэтых раёнах усё „добрыя“ нездатчыкі, а злосных мала.

### Саромеюцца падагнаць кулака

Па вестках-жа прысланых з раёнаў відаць, што кулак не сьпяшаецца здаваць, на штосьці спадзяецца, а мясцовыя работнікі чамусьці (?) саромеюцца яго падагнаць. У выніку, ня гледзячы на ўсе прапушчаныя тэрміны па здачы кулацка-заможнымі гаспадаркамі, здана ў сярэднім толькі 25—30 проц., прычым у паасобных раёнах здача кулакамі хістаецца ад 7,3 да 86 проц. іх зданьня.

Ня гледзячы на такія нахабныя паводзіны кулацка-заможных гаспадарак, толькі 35 раёнаў прымянілі да кулакоў меры адміністрацыйнага і судовага спаганяньня, падпарадкаваўшы штрафу 5.3 проц. кулацкіх двароў і здаўшы пад суд 3 проц. Але застаецца ня высьветленым ці суддзілі іх. А то ёсьць выпадкі як, напрыклад, Белільнок напляводсаюзам было здана ў Расонскім раёне 108 спраў судовай інстанцыі па Сіроцінскім—43 справы, па Лепельскім—27, па Мсьціслаўскім—30 і г. д., а яны ў большасьці ляжаць у сталох судовых устаноў, з канца сьнежня і дагэтуль не разабранымі. Белільнопаляводсаюз не патрабаваў прысьпешыць разбор гэтых спраў прокуратураю.

Зразумела, што такія адносіны да разбору спраў злосных нездатчыкаў не ствараюць стымулу к здачы, а наадварот, забясьпечваюць прывольнае жыцьцё кулаку і прыклад для іншых. Характэрны і разьмер цьвёрдага абкладаньня на кулацка-заможныя гаспадаркі, які не перавышае ў сяр… нім 50 кілёграм на гаспадарку, … нямногім розьніца па разьмерах зд… серадняцка-бядняцкім дваром у … радку добраахвотнага самаабкладан…

Такія неахайныя адносіны кіра… коў раёнаў да дырэктывы ЦК Бе… русі і ў прыватнасьці такое па… ран не кулацка-заможным гаспа… кам зьяўляецца правым опортуні… на практыцы.

Ня гледзячы на пастановы … УсеКП(б) і ЦК Беларусі аб тым, … комсамол прыняў актыўны ўдзе… ільназагатоўках і організацыі веча… на вёсках і сёлах для мяцьцю і тр… ны лёну, пастанова ня выканана.

Што-ж рабілі ў такім выпадку … тральныя організацыі? Чаму яны … падцягвалі месцы?

Аб гэтым Цэнтральны Камітэт … ларусі на пасяджэньні бюро ад 1 … тага, констатуючы недапушчальны… загатовак, даручыў ЦКК і РСІ Бе… русі праверыць як выконваліся і … конваюцца дырэктывы партыі і ўр… як цэнтральнымі, так і раённымі … ганізацыямі з прыцягненьнем він… тых асоб да адказнасьці.

Зараз ЦКК РСІ прыступіла … ажыцьцяўленьня пастановы ЦК. … думаем, што ў найкарацейшы тэр… будзе выяўлены ўдзел як гаспадар… так і савецкіх і партыйных орган… ный у справе ільназагатовак. Яна … жа ўдарыць вінаватых у неахай… адносінах да дырэктыў і расп… джэньняў партыі і ўраду, узьняў… іх на прынцыповую вышыню. ЦК… РСІ выявіць твар кіраўнікоў раё… ня прыслаўшых вестак аб кула… заможных гаспадарках і аб „пры… нах“ такіх лагодных да іх адносін.

Яна выявіць і ўдзел судовых ор… наў і друку і ўказаўшы іх мес… ільназагатоўках, абавяжа давед… рухаючай сіле соцспаборніцтва па… раёнамі і ўкажа на няправільнае р… меньне соц. спаборніцтва па асоб… перадавых раёнаў, якія растаргі… дагавор з адстаючымі раёнамі зам… таго, каб узяць іх на буксір.

ЦКК узялася і расчысьціць шлях… загатоўках, лёну і пянькі павыця… палкі з калёс, якія натыкаў кул… заможны, карыстаючыся опортуніс… ным патураньнем кіраўнікоў.

Лён ёсьць, яго толькі трэба ум… ўзяць, трымаць цьвёрда клясавую … нію ў ільназагатоўках. Дырэктыў … волі, трэба іх толькі выканаць.

Комсамол!

Уключыся на дапамогу, паўт… сваю сьветлую старонку па загат… ках бульбы. Люты месяц павінен … шыць ільназагатоўкі, наверстаць у… шчаны і выканаць свой плян.

А гэта патрабуе толькі максы… увагі і бальшавіцкай настойлівасьц… таксама строгай прынцыповасьці … дырэктыў партыі і ўраду.

Брыгада ЦК УсеКП(…
АДАМСОН ЧАРАТА…


Час. вык. абав. адк. рэдактара—
С. АНІС…


### Згублены

— Комсамольскі біл. за № 71573 … імя Сабалеўскай А. А., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Сяброўскі білет за № 3167. … імя Хмялеўскага В. С., выд. ЦП с… зу харчав.

— Комс. білет за № 53854, на Яўсюціцай В. У., выдан. Менскім КСМ.

— Комсам. біл. за № 72595, на Новагрудзкага Л. А., выдан. Мен. ЛКСМБ.

— Комс. білет за № 13405, на … Усоўскага П., выдан. Аршанскім … КСМ.

— Профсаюзны білет за № 75… на імя Усоўскага А., выд. аршан… вучпрофсожам.

— Комсам. білет на імя Дынэрш… на Г. А., выданы Менскім ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет зб № 13… на імя Шымшэлевіч, выд. Мен. … ЛКСМБ.

— Комсам. білет за № 71750, … імя Марголінай Е. Ю., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 725… на імя Данілевіча М., выд. Ракош… кай яч. КСМ.




Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599